# МЕТАД АКТЫЎНАЙ АЦЭНКІ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў ПАЧАТКОВЫХ КЛАСАХ

*Н.В. Крыцкая*
*Віцебск, ВДУ імя П.М. Машэрава*

Трапляючы ў школу, дзіця ў першую чаргу мае патрэбу ў тым, каб атрымаць пацверджанне сваёй значнасці ад настаўніка, бо менавіта ад настаўніка ён залежыць. У жыцці кожнага настаўніка і вучня існуе праблема адэкватнага ацэньвання ведаў апошняга. Вучань пачатковай школы мае патрэбу ў ацэнцы літаральна кожнага свайго намагання. Але як арганізаваць адукацыйны працэс, каб гэтыя намаганні былі накіраваны не дзеля адзнакі настаўніка?

Актуальнасць пытання ацэначнай дзейнасці вучняў на ўроку не зніжаецца, а па-ранейшаму застаецца адной з важнейшых педагагічных праблем. У снежні 2013 года PISA-2012 (Programme for International Student Assessment – міжнародная праграма па ацэнцы адукацыйных дасягненняў вучняў) апублікавала вынікі даследавання якасці агульнай адукацыі. Кожныя тры гады вядзецца апытванне: «Ці валодаюць навучэнцы 15-гадовага ўзросту, якія атрымалі абавязковую агульную адукацыю, неабходнымі ведамі і ўменнямі для паўнавартаснага функцыянавання ў сучасным грамадстве?” У дзясятку краін лідэраў увайшлі Кітай, Японія, Фінляндыя, Галандыя, Польшча. Расія і Беларусь знаходзяцца на 34-41 месцы з 250 удзельнікаў. Ці дастаткова такога выніку? На думку спецыялістаў, адным з фактараў, якія ўплываюць на якасць адукацыі, з’яўляецца актыўная ацэнка.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам для даследавання паслужыу аналіз вучэбнай дзейнасці навучэнцау 3-га класа. Выкарыстаны агульнанавуковыя метады тэарэтычнага даследавання. Для выдзялення асобных прыкмет, уласцівасцей аб’екта доследу быў прыменены метад аналізу. З мэтай сістэматызацыі розных бакоў аналізуемай з’явы выкарыстан метад сінтэзу. Для выдзялення і фіксацыі якасцей аб’ектаў і іх адносінаў выкарыстан метад абагульнення. У аснову вывадаў пакладзены метад індукцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Звернемся да тлумачэння паняцця “ацэнка”, “актыўная ацэнка”. На думку англійскіх вучоных Пола Блэка і Дыла Уільяма, ацэнка – гэта такая дзейнасць педагога і вучняў у ацэньванні саміх сябе, якая дазваляе атрыманую інфармацыю выкарыстоўваць у якасці зваротнай сувязі для мадыфікацыі дзейнасці выкладання і навучання. Такая ацэнка ператвараецца ў актыўную ацэнку, калі яна выкарыстоўваецца для адаптацыі выкладання, якое адказвае патрэбам навучэнцаў [2].

Больш спрошчанае азначэнне паняцця “актыўная ацэнка” знаходзім у Дануты Стэрна: «Актыўная ацэнка – гэта перадача навучэнцам інфармацыі, якая дапамагае ім вучыцца» [3, с.11]. У нашым разуменні, ацэнка – гэта вызначэнне ва ўмоўных знаках-балах, а таксама ў ацэначных меркаваннях настаўніка ступені засваення ведаў, уменняў і навыкаў, устаноўленых праграмай, узроўню старанасці і стану дысцыпліны, а актыўная ацэнка –гэта інтэрактыўная ацэнка здольнасцяў і магчымасцяў вучняў, якая дазваляе вызначыць стратэгію іх далейшага навучання.

Актыўная ацэнка – гэта не метад выстаўлення адзнак, а методыка, якая складаецца з розных тэхнік, якія дапамагаюць настаўніку вучыць. Яна стварае спрыяльную атмасферу для павышэння якасці ведаў вучняў, дапамагае праводзіць заняткі настаўніку так, каб дзецям было цікава вучыцца. Прынцыпамі актыўнай ацэнкі з’яўляюцца:

1. **Планаванне мэт урока.** Напрыклад,

**Тэма:** Гук [м], літары М, м.

**Мэта:** вывучыць новы гук [м] і літары М, м, якія яго абазначаюць; вывучыць склады з дадзенымі літарамі, пачаць чытанне слоў з вывучанымі літарамі.

**Мэта ўрока мовай вучняў:** у канцы ўрока вы зможаце вылучыць гук [м] у словах; даведацца, як гэты гук абазначаецца на пісьме; зможаце прачытаць склады і словы з літарай М, м.

Мэта ўрока павінна быць канкрэтнай, вымяральнай, дасягальнай, рэалістычнай і абмежаванай ў часе. Такі падыход дасць магчымасць у даступнай форме данесці да вучняў канкрэтную інфармацыю аб тым, што і для чаго яны будуць рабіць на ўроку, а у канцы ўрока дазволіць навучэнцам самастойна ацаніць сваю дзейнасць.

2. **Крытэрыі ацэнкі.**

Настаўнік разам з вучнямі павінен вызначыць, на што будзем звяртаць увагу пры ацэнцы. Крытэрыі дапамагаюць вучням лепей падрыхтавацца да ўрока, падказваюць, як выканаць тую

ці іншую работу, каб дасягнуць мэт. Справа ў тым, што навучэнцы часцей не ведаюць крытэрыяў ацэнкі вынікаў дзейнасці. Настаўнік можа арганізаваць вучняў на выпрацоўку крытэрыяў, напрыклад, паспяховага сачынення, працы з тэкстам, тэстам, вуснага адказу і г.д. Першыя крытэрыі ацэньвання прапануюцца настаўнікам, потым іх можна выпрацоўваць сумесна: навучэнцы і настаўнік. Для ацэньвання і самаацэнкі выбіраюцца толькі такія заданні, у якіх можна вылучыць адназначны паказчык ацэньвання.

Польскія настаўнікі пры ацэнцы дзейнасці навучэнцаў і яе вынікаў крытэрыі паспяховага выканання задання, свае чаканні ад навучэнцаў называюць адным словам-акронімам «наштобузу» (На Што Буду Звяртаць Увагу) Наштобузу з'яўляецца моцным інструментам зваротнай сувязі, які забяспечвае высокі ўзровень вучэбнай матывацыі. Напрыклад, крытэрыі паспяховасці па тэме "Сказ": 1. Умець вызначаць граматычную аснову сказа. 2. Устанаўліваць сувязь паміж словамі ў сказе. 3. Вызначаць сказы па мэце выказвання. 4. Умець ставіць знакі прыпынку ў канцы сказаў.

Выразна пазначаныя крытэрыі ацэньвання дазваляюць педагогу граматна ажыццяўляць зваротную сувязь, якая з'яўляецца ядром актыўнай ацэнкі.Эфектыўнасць зваротнай сувязі залежыць ад таго, як настаўнік арганізуе зваротную сувязь на розных этапах урока: этапе планавання, правядзення і аналізу ўрока.

**3. Зваротная сувязь.**

Адной з эфектыўных формаў ажыццяўлення зваротнай сувязі на ўроках беларускай мовы ў пачатковых класах з'яўляецца праверка вучнёўскіх работ. Так сама зваротнай сувяззю можна лічыць каментарый на працу навучэнцаў, які ўключае: 1) падкрэсліванне станоўчых бакоў дзейнасці вучня і ўказанне на тое, што павінна быць выпраўлена; 2) «падказкі» і рэкамендацыі: як гэта можна зрабіць і ў якім кірунку павінен рухацца далей вучань.

Зваротная сувязь не з'яўляецца ацэнкай вучня, а толькі ацэнкай наступнага выніку яго працы.

**4. Ацэнка і самаацэнка.**

Сфарміраваная самаацэнка – адно са значных новаўтварэнняў малодшага школьніка, якое дазваляе рэгуляваць яго паводзіны і вучэбную дзейнасць. Р. Бёрнс сцвярджае, што «самаацэнка адлюстроўвае ступень развіцця ў індывіда пачуцця самапавагі, адчування ўласнай каштоўнасці і пазітыўнага стаўлення да ўсяго таго, што ўваходзіць у сферу яго" Я "» [1, 36].

Прывядзём прыклад ажыццяўлення вучнямі прагнастычнай ацэнкі сваіх ведаў у працэсе выканання стартавай праверачнай работы па беларускай мове ў 3-м класе. Навучэнцам прапануецца ацаніць, пазначыць у графе «прагнастычная адзнака» колькасць балаў за выкананне кожнага задання стартавай праверачнай работы, якую яны будуць выконваць на ўроку. Напрыклад, умею падбіраць да слова роднасныя словы і выдзяляць у іх корань; умею правільна запісваць слоўнікавыя словы і г.д.

**Заключэнне.** Такім чынам, метад актыўнай ацэнкі дазваляе вучням арыентавацца ў сваіх ведах, а настаўніку скіраваць сваё планаванне на праблемныя моманты ў засваенні матэрыялу.

Спіс літаратуры

1. Бернс, Р. Развіццё «Я-канцэпцыі" і выхаванне / Р. Бернс. - М.: Прагрэс, 1986. - 420 с.
2. Black, P. Inside the Black Box: Raising standards through classroom assessment / P. Black, D. Wiliam. - London: King's College, 1998. - 139 p.
3. Стэрна, Д. Ацэнка, непадобная ні да чаго / Д. Стэрна // Актыўная аценка: метад. дапам / укл.Н. Ільініч. - Мінск, 2011. - 84 с.

## РАЗВИТИЕ ТВОРЧЕСКОЙ АКТИВНОСТИ У МЛАДШИХ ШКОЛЬНИКОВ В ПРОЦЕССЕ ПЕДАГОГИЧЕСКОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ

*Е.А. Кущина*
*Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова*

В настоящее время актуальным становится вопрос о развитии и формировании творческой активности ученика, вновь ставится на повестку дня в педагогической науке и практике. Это связано с тем, что, творческая активность представляется одним из ключевых качеств личности; если мы признаем ученика субъектом обучения, то вопрос о его активности в учебно-познавательной деятельности должен лежать в основе решения всех остальных проблем. Активность не является неизменным наследственным свойством, она формируема. Актуальность исследований проблемы развития творческой активности обусловлена требованиями личностно-ориентированного подхода в обучении.



Репозиторий ВГУ